**Базыль, С.** «Калі не я, то хто?» / С. Базыль // Лепельскі край. — 2009. — 6 сак. — С. 4.

**«КАЛІ НЕ Я, ТО ХТО?»**



Міхаіл нарадзіўся ўсям'і ваеннага, таму дэвіз савецкіх афіцэраў «Калі не я, то хто?» стаў і яго галоўным законам жыцця. Яго бацька памёр, калі сыны яшчэ былі школьнікамі. Змалку Міхаіл займаўся лёгкай атлетыкай, нават спрабаваў асвоіць азы каратэ, але на той час спецыялісты па гэтым відзе спорту былі вельмі рэдкімі. Але хлопцу пашчасціла: у інтэрнаце сельгастэхнікі пасяліліся кампучыйцы, якія прыехалі сюды на прамысловую практыку. А ў іх адзінаборствы, і ў прыватнасці таэквандо, – школьны прадмет. Так Міхаіл у спартыўнай зале пасябраваў з кампучыйцам Ратхі, які адкрыў беларусу свет новага віду спорту.

У маі 1984 года Міхаілу Тарасаву прыйшла павестка з ваенкамата. Прызываўся ён разам са старэйшым брагам, толькі таму выпала служыць на Далёкім Усходзе. Сам Міхаіл марыў служыць у марской пяхоце, але ў той год набору туды не было, таму яго накіравалі ў десантную часць, адтуль – у Афган.

Спачатку быў месяц вучэбкі ў Фергане, з якога найбольш моцным успамінам застаўся паўсюдны пах хлоркі. А праз месяц нечакана прыйшоў загад накіраваць каманду ў школу кухараў у Чырчык. З чэрвеня па лістапад адслужыў там Міхаіл, і для сябе зрабіў выснову са скуры вон вылезу, а ў сталоўцы служыць не буду!

Самалёт Ташкент–Кабул, размеркаванне ў 317-ы паветрана-дэсантны полк 103 паветрана-дасантнай дывізіі. Спачатку Міхаіла Тарасава і сапраўды накіравалі ў сталоўку, там ён кожны дзень канфліктаваў з начальнікам. Сведкам адной з такіх сцэн стаў камандзір разведроты капітан Дзмітрый Гарбуноў. Ён спытаў у маладога саддата, ці хоча той служыць у разведцы, і атрымаўшы станоўчы адказ, прамовіў: «Заутра ж з рэчамі ў казарму разведроты». Так пачаліся баявыя будні. Афіцыйна радавы Міхаіл Тарасаў быў залічаны ў разведроту кухарам, але гэтыя абавязкі ён выконваў толькі на вялікіх баявых выхадах, калі разведчыкі бралі з сабой палявую кухню, што было крайне рэдка. На малых жа аперацыях, якія адбываліся значна часцей, ён са старшыной роты атрымліваў на харчскладзе паёк, раздаваў яго байцам і разам з усімі ішоў у горы.

Дарэчы, колькі слоў пра старшыну, пад непасрэдным начальствам якога праходаіла служба Міхаіла. Прапаршчык Эдуард Анучын лічыўся самым гераічным і смелым старшынои ва ўсёй 103-й Віцебскай паветрана-дэсантнай дывізіі. Паказальны такі эпізод. На пазіцыях скончылася вада, аспёка даходзіла да +50.

Сгаршына бярэ аўтамат, камандуе: «Тарасаў, за мной!» Разам яны садзяцца ў ГАЗ-66 з бочкай і едуць у горад у пошуках калодзежа. Без усялякай аховы! Ехаць па вузенькіх крывых вулачках, ведаючы, што ў любы момант з-за вугла цябе могуць зрэзаць аўтаматнай чаргой – выпрабаванне не для слабых нерваў.

Урэшце знайшлі студню, набралі вады і вярнуліся да сваіх. У шчаслівы зыход такой прыгоды ніхто не мог паверыць, бо незадоўга да тага пры падобных абставінах прапала машына з

вадзіцелем і суправаджаючым. Праз некалькі месяцаў старшына Анучын трапчна загінуў. Незадоўга да гібелі ён падарыў Міхаілу сцізорык, той бярог яго ўсю службу як талісман.

* * *

**– *Якія маеце* ўзнагароды?**

– Медаль «За баявыя заслугі» атрымаў за ўдзел у аперацыі на перавале Гульдара. Пры яга прачэсванні мы знайшлі шмат душманскіх схованак са зброяй. Працаваць тады прыйшлося ў пякельных умовах: спёка за +50, высокія горы. Байцы выматваліся, сабакі сапёраў ледзь дыхалі. Там жа мы ўбачылі слуп Аляксандра Македонскага. Дзесьці за паўтарагода ён заваяваў велізарную Персідскую імперыю, а потым рушыў у Афганістан, дзе яга непераможная армія ваявала дзесяць гадоў. Так ні з чым ён адтуль і пайшоў. На высокай калоне высечаны словы: «Прайсці гэту краіну можна, заваяваць – немагчыма».

Поўнач Афганістана кантралявалі падраздзяленні палявога камандзіра Ахмад Шаха Масуда па мянушцы Панджшэрскі Леў (яго асноўным месцам была Панджшэрская цясніна). Гэта быў адважны, рашучы бой. Да вайна скончыў політэхнічную навучальную ўстанову ў Кабуле і ВНУ ў Францыі. Ваенным быў яго бацька, ён даў сыну азы ваеннай справы, астатняе той пасцігаў на практыцы. На поўдні ж нам супрацьстаяў палявы камандзір Гульбеддзін Хекмацьяр – поўная процілегласць Масуду. Ісламскі фанатык, ненавіснік усяго еўрапейскага. Менавіта яго бандыты вызначаліся жорсткасцю і садызмам, асабліва ў адносінах да палонных.

* * *

Летам 1985 года капітан Гарбуноў пайшоў на павышэнне, яго замяніў Аляксандр Калпачэнка. Зараз ён ужо генерал-камандзір Пскоўскай паветрана-дэсантнай дывізіі.

У чэрвені 1985 года здарылася трагедыя, на  Далёкім Усходзе пад час службы загінуў брат Міхаіла. Пасля  перапіскі і кансультацыі камандаванне прыняло рашэнне аб  вяртанні Міхаіла ў Саюз, што і было зроблена ў лістападзе. У маі 1986 года скончылася служба М. Тарасава.

Па вяртанні Міхаіл уладкаваўся на  экскаватарарамонтны завод, паступіў завочна ў інстытут культуры.  Арганізаваў суполку ветэранаў-афганцаў, дапамагаў вырашаць бытавыя і жыллёвыя праблемы. У 1987 годзе Міхаіл ажаніўся, стаў працаваць інструктарам райкама камсамола, у клубе Сельгастэхнікі  аргазаваў  ВІА, адчыніў першую ў раёне відэазалу. У пачатку 90-ых вырашыў працаваць на сябе, стаў прадпрымальнікам, а зараз ён кіруе невялікім прадпрыемствам «ХайТэкАльянс», займаецца  распрацоўкамі ў сферы кампьютэрных тэхналогій.

Былі розныя  перыяды, узлёты і падзенні, але заўсёды разам з ім была верная сяброўка Наталля. У іх нарадзіліся двое сыноў. Старэйшы Саша працуе ў Мінску, збіраецца паступаць у ВНУ, а Раман вучыцца ў другім класе.  Міхаіл з гэтай  нагоды кажа: «Я зноў вучуся. А хто, калі не я».

**С. Базыль**

***На здымку: Міхаіл Тарасаў***

***Фота з сямейнага альбома***